Такім чынам можна ўбачыць, што адлюстраванне дурасці ў гумарыстычных творах беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў і літоўцаў з’яўляецца адначасова крытычным і рэалістычным. Шматбаковасць высмейвання гэтай заганы дае падставу казаць пра распаўсюджанасць жартаў на гэты конт, што, у сваю чаргу, падкрэслівае важнасць розуму і здаровага сэнсу для жыхароў дадзенага рэгіёна.

**Літаратура**


1. *Кирчів Р. Ф.* Двадцяте століття в українському фольклорі. Львів, 2010. (ІН НАН України).
2. Новый Крокодил: журнал сатиры и юмора. Москва, 2002-2004. №1. (Издательский дом «Крокодил»).
3. Польский юмор: [Сборник. Переводы]. М. – Л, 1963. (Искусство).
4. Українська народна сатира і гумор / [Упорядкування та вступ. стаття "Гостра зброя народу", с. 3–18, Г. А. Нудьги]. Львів, 1957. (Кн.-журн. вид.).
5. Чаян: Дайджест. Казань, 1992. (Татар. газ.-журн. изд-во).
6. Encyklopedyja humoru: zawierająca najcelniejsze utwory humoru ludzkiego / redakcyja i nakład M. Wałuwskiego. T. 1: A–I. T. 2 : J–M, [1890]. T. 1.
7. Roj żartów: dwumiesięcznik / Oficyna literatów "Rój". Warszawa, 1993. №2. (Oficyna literatów "Rój").


# ДАКУМЕНТЫ ФОНДА «ПРОВИНЦИАЛ БЕЛОРУССКОЙ ПРОВИНЦИИ БАЗИЛИАНСКОГО ОРДЕНА» У НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ГІСТАРЫЧНЫМ АРХІВЕ БЕЛАРУСІ


**Ю. С. Зенчанка**


У складзе Гістырычнага архіва есць некалькі фондаў, матэр’ялы якіх тычуцца Базыльянскага ордэна і асабліва трэба адзначыць фонд 3421, храналагічныя межы якога складаюць 1748–1838 гг. Усяго у фондзе захоўваецца 326 спраў.

Беларуская правінцыя Базыльянскага ордэна пад тытулам Св.Мікалая была заснавана ў 1780 г. рашэннем паседжання капітулы ордэна ў Тараканскім манастыры. У яе склад ўваходзілі базыльянскія манастыры на тэрыторыях, якія адышлі да Расійскай імперыі пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай у 1772 г. Па стану на 1801 г. яна складалася з 14 манастыроў, у якіх знаходзілася 104 манахі. Цэнтр правінцыі знаходзіўся ў манастыры, настаяцель якога на тры гады выбіраўся правінцыялам, пры ім знаходзіўся і архіў правінцыі.

Усе віды дакументаў фонда, у залежнасці ад месца складання, можна падзяліць на знешнія і ўнутраныя. Да першай групы адносяцца ўсе дакументы, якія былі створаны знешнімі ведамствамі, такія, як указы Сената і Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі. Да ўнутраных дакументаў

адносяцца выдадзеныя непасрэдна Беларускай правінцыяй, ці створаныя манастырамі, напрыклад, вопісы дакументаў манастырскіх архіваў і бібліятэк.

Па зместу большасць дакументаў фонду тычыцца гаспадарчых спраў правінцыі. Увогуле, дакументы гаспадарчага характару былі для ордэна самымі важнымі, таму яны з'яўляюцца вельмі дакладнымі і падрабязнымі. Значную колькасць складаюць распарадчыя дакументы і судзебныя справы, рашэнні, выпісы з судзебных рашэнняў.

Найбольш шырока гаспадарчыя дакументы прадстаўлены **інвентарамі** манастыроў, якія прадстаўлялі сабой штогадовы, вельмі падрабязны вопіс маёмасці, з пазначэннем таго, што ўбыла і прыбыла [1]. Да гаспадарчых дакументаў адносяцца і **акты візітаў манастыроў**. Гэтыя дакументы адлюстроўваюць рэвізіі манастыроў пэўнай губерніі, а інфармацыя ў іх была прадстаўлена па пунктах: колькасць фальваркаў манастыра, валок і «душ», якія іх апрацоўвалі; стан будынкаў манастыра, яго цэркваў; колькасць засеяных і сабраных сельскагаспадарчых культур; матэр'яльны стан падданых манастыра [2, арк. 1]. Сярод пералічаных дакументаў трэба адзначыць **ведамасць аб стане пабудоў манастыра**, якая ўяўляла сабой апісанне маёмасцей манастыроў на польскай мове [3].

Самым распаўсюджанным у фондзе відам дакументаў з'яўляецца **рапарт**, іх колькасць складае каля 20 адсоткаў ад ўсяго комплексу. Вядома, што рапарт, як афіцыйны даклад, паведамленне аб выкананні ўзятых на сябе абавязацельстваў, больш характэрны для ваеннай справы. Таму да падзелаў Рэчы Паспалітай і стварэння Беларускай правінцыі, базыльянскія манастыры не стваралі рапарты. Але хваляванні ўнутры ўніяцкай царквы, магчыма, выклікалі неабходнасць увесці больш жорсткі кантроль за выкананнем распараджэнняў вярхоўнай улады. Рапарты пісаліся на рускай і польскай мовах, але нярэдкім было пазначэнне адрасата на рускай мове, а тэкст рапарта быў напісаны па-польску. У справу падшываўся ўласна аркуш з рапартам і канверт з пазначэннем адрасата і пячаткай манастыра. Рапарты прадстаўлялі сабой справаздачы аб атрыманні прадпісанняў [4, арк. 58–59].

Што тычыцца распарадчых дакументаў, у прыватнасці **ўказаў Рымска-каталіцкай духоўнай Калегіі**, то яны пісаліся на рускай мове, і звычайна з'ўляліся рэакцыяй на вышэйшыя імператарскія ўказы. Па большасці, указы носяць арганізацыйны характар: яны тычуцца прызначэнняў на пасады, павышэнняў, пераводаў з адной пасады на іншую [5].

Да распарадчых дакументаў таксама можна аднесці **прадпісанні Беларускага грэка-уніяцкага епіскапа**. Напрыклад, «Предписания

Белорусского греко-униатского епископа за 1839 г.», калі дадзеную пасаду займаў Іакаў Мартусевіч [6]. Прадпісанні тычуцца самых розных пытанняў, але па большасці арганізацыйных: своечасовага прадстаўлення сведчанняў для Грамадзянскіх прысутных месцаў, забароны на разбурэнне птушыных гнездаў, выпраўлення памылак у паслужных спісах. Гэтыя дакументы паказваюць, наколькі глыбока Базыльянскі ордэн быў інкарпарыраваны ў сетку бюракратычных ўстаноў Расійскай імперыі, паколькі дзейнасць гэтай, калісьці даволі самастойнай арганізацыі, цяпер патрабавала ўсебаковай справаздачнасці і каардынацыі.

Каштоўную крыніцу па гісторыі Базыльянскага ордэна прадстаўляюць сабой **паслужныя спісы святароў**. Спісы складаліся па Рэгламенту 1798 г. штогод епіскапамі тых епархій, у якіх знаходзіліся базыльянскія манастыры. У іх пападалі базыльяне, якія на момант збору інфармацыі выконвалі абавязкі па кіраванню манастырамі, выкладалі ў ордэнскіх ці свецкіх школах. У фондзе знаходзіцца, напрыклад, «Послужной список высшего духовенства Базилианского униатского ордена Белоруской провинции за 1817 г.» [7].

Як справядліва меркаваў С.М. Клімаў, у фондзе 3421 есць справы, якія ўтрымліваюць **уваходзячыя і зыходзячыя дакументы** [8]. Яны дазваляюць выявіць змены, якія адбываліся ў справаводстве Базыльянскага ордэна. Калі параўноўваць уваходзячыя дакументы за 1804–1806 і 1814 гг. можна вылучыць шэраг адрозненняў. Па-першае, дакументы самага пачатку XIX ст. былі напісаны на рускай і беларускай мове, для справаводства дзяржаўных органаў больш позняга часу быў характэрны пераход на рускую мову. Тыя распараджэнні, якія даваў правінцыял згодна атрыманым указам пісаліся па-польску. Цікава адзначыць, што ў адрасаце замест слова «базыльянскіх» пісалі «васіліянскіх» манастыроў. Такім чынам, можна зрабіць выснову, што улады сур'езна ставіліся да пераводу справаводства на былых землях Рэчы Паспалітай на рускую мову, паколькі не дазволілі пакінуць лацінскую транслітэрацыю слова. Па-другое, віды дакументаў за 1804–1806 гг. былі разнастайнымі: імператарскія ўказы, прашэнні, рапарты, тлумачальныя запіскі, юдыцыі, а ўваходзячыя дакументы 1814 г. гэта – ўказы і рапарты. Указы ранейшага перыяду ў асноўным тычуцца гаспадарчых спраў.

Такім чынам, дакументы фонда можна падзяліць на два віда: справоводчыя і дакументы царкоўнага і гаспадарчага уліку.

У першым відзе вылучаюцца дакументы па іх функцыянальным прызначэнні: прынятце і рэалізацыя кіраўніцкіх рашэнняў Беларускім правінцыялам, Полацкай кансісторыяй і органамі дзяржаўнай улады

(распарадчыя, справаздачныя дакументы) і спецыяльная справаводчая дакументацыя Беларускай правінцыі (судовыя справы).

Распарадчыя дакументы:

- пастановы Полацкага уніяцкага архіепіскапа Іраклія Лісоўскага;
- пастановы галоўнага Магілёускага суда і Літоўскага трыбунала;
- прадпісанні правінцыяла Беларускай правінцыі Базыльянскага ордэна;
- указы Сената і Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі, а таксама асобна Сената і асобна калегіі;
- указы Полацкай уніяцкай духоўнай кансісторыі і Рымска-каталіцкай духоўнай калегіі;
- пратаколы паседжанняў кансульты і капітулы Беларускай правінцыі Базыльянскага ордэна;
- паслужныя спісы архімандрытаў і кіраўнікоў манастыроў Віцебскай і Магілёўскай губерній;
- фармулярныя спісы і ведамасці святароў манастыроў.

Справаздачныя:

- даклад Сената Аляксандру І;
- рапарты манастыроў Віцебскай і Магілёўскай губерній па гадах.

Судовыя:

- выпісы з рашэнняў галоўнага Магілёўскага суда, з кніг Віцебскага земскага павятовага суда;
- судовыя рашэнні Полацкага духоўнага суда;
- Другі від прадстаўлены дакументамі царкоўнага і гаспадарчага ўліку:
- ведамасці, якія сведчаць аб стане манастыроў ;
- візіты манастыроў Віцебскай і Магілёўскай губерній;
- вопісы дакументаў манастырскіх архіваў і бібліятэк;
- вопісы маёмасці манастыроў;
- інвентары манастыроў, якія складзены пераважна на польскай мове;
- кліравая ведамасць Вербілоўскага манастыра Себежскага павета Віцебскай губерніі за 1822 г.;
- сведчанні аб колькасці манастыроў і школ пры іх.

У выніку вывучэння фонда можна зрабіць выснову, што большасць яго дакументаў, асабліва канца XIX ст., носяць гаспадарчы характар. Яны даюць даследчыкам багаты матэр’ял для вывучэння штодзеннага жыцця, маемаснага стану манастыроў, асаблівасцяў іх пабудоў.

Распарадчыя дакументы, у сваю чаргу, дазваляюць прасачыць адносіны манастыроў з кіраўніцтвам ўніякай царквы і расійскімі

ўладамі. Так, указы першай трэці XIX ст. адлюстроўваюць негатыўную раэкцыю манахаў на дзяржаўную палітыку ў дачыненні да ўніяцкай царквы.

У параўнанні з гаспадарчым жыццем і афіцыйнымі адносінамі, значна менш інфармацыі дае фонд аб асобах, якія уваходзілі ў склад ордэна. Аб характары вышэйшых духоўных асобаў можна даведацца дзякуючы паслужным спісам, але і гэтыя сведчанні даволі скупыя, а пра простых манахаў сведчаць толькі справы аб іх злачынствах ці зменах абраднасці.

**Літаратура**


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ).
2. Фонд 3421. Воп. 1. Сп. 8. Инвентарь Витебского монастыря за 1785 г.
3. Фонд 3421. Воп. 1. Сп. 147. Визиты Могилевской губернии за 1817 г.
4. Фонд 3421. Воп. 1. Сп. 274. Ведомости о состоянии строений монастырей: Березовского Дисненского пов. и Логойского Борисовского пов. Минской губ. и инвентари монастырей Витебского, Пинского и Лисовского Рогачевского пов. Могилевской губ. за 1829 г.
5. Фонд 3421. Воп. 1. Сп. 90. Рапорты монастырей Витебской и Могилевской губерний за март-май 1809 г.
6. Фонд 3421. Воп. 1. Сп. 257. Указы Римско-Католической духовной коллегии за 1827 г.
7. Фонд 3421. Воп. 1. Сп.271. Предписания Белорусского греко-униатского епископа за 1839 г.
8. Фонд 3421. Воп. 1. Сп.154. Послужной список высшего духовенства Базилианского униатского ордена Белорусской провинции за 1817 г.
9. *Климов С.М.* Базилиане. Могилев: МГУ, 2011. С. 18.


## СРАЖЕНИЕ ПОД КЛЯСТИЦАМИ 30 ИЮЛЯ – 1 АВГУСТА 1812 ГОДА

**А. В. Иванов**

Летом 1812 г. на территории Беларуси происходили напряжённые оборонительные сражения русских войск с войсками Наполеона под Миром, Салтановкой, Клястицами. Сражение под Клястицами проходило на территории современной Республики Беларусь и укладывается в определённый хронологический отрезок времени – июль – начало августа 1812 г. Сражение было проведено в условиях численного превосходства французов и со стороны русских войск имело целью сковать наполеоновские силы, чтобы обеспечить отступление на восток и защиту стратегически важного направления на Петербург. Русским войскам удалось достичь этих целей и нанести наполеоновским войскам чувствительные потери, а в ряде случаев даже заставить их отступить.

Предпосылками к сражению явилось отступление 1-й русской Западной армии от Дрисского лагеря к Витебску Для прикрытия стратегиче-